# Адысея Напалеона Орды

## Споўнілася 210 гадоў з дня нараджэння мастака і кампазітара, які творча ўслаўляў Беларусь

**На пачатку 1856 года заможны па тагачасных мерках жыхар французскай сталіцы і ўвогуле неблагі сем'янін Напалеон Орда абвясціў сябрам і блізкім пра свой намер пакінуць горад на берагах Сены і перасяліцца на радзіму – на Палессе. Многія тады яго не зразумелі. Не падтрымала і жонка, якая адразу ж заявіла, што нікуды не збіраецца ехаць і разам з 11-гадовым сынам застанецца ва ўтульнай парыжскай кватэры. Але ні катэгарычная жончына адмова, ні сяброўскія адгаворы-кпіны, ні нават яскравае ўсведамленне таго, што ў родных мясцінах чакае далёка не сардэчная сустрэча, творцу не спынілі. Ахвяраваўшы ўсім, што ўдалося займець за 25 гадоў жыцця на чужыне, ён накіраваўся туды, дзе прайшла яго маладосць, куды клікала сэрца і куды рвалася душа.**



▲ Герб роду Ордаў

### Варацэвічы

А месцам неймавернага прыцягнення мрояў Напалеона Орды былі Варацэвічы. Сёння – гэта вёска ў Іванаўскім раёне Брэсцкай вобласці. Акурат тут, а дакладней – у маёнтку побач з гэтым палескім паселішчам, 210 гадоў таму і суджана было нарадзіцца будучаму мастаку і кампазітару. Яго бацька Міхал Орда быў інжынерам-фартыфікатарам, маршалкам шляхты Кобрынскага павета, а маці Юзафіна нарадзілася ў сям'і пінскага суддзі і мечніка Матэвуша Бутрымовіча. Паводле сямейнага падання, род Ордаў паходзіў ад татараў Залатой Арды. Далёкі продак Напалеона ў канцы XIV стагоддзя быў запрошаны вялікім князем літоўскім Вітаўтам да сябе на вайсковую службу. Яго нашчадкі таксама станавіліся ваярамі і, прыняўшы хрысціянства, засвоіўшы мову, культуру сваёй новай радзімы, аддана служылі ёй, абараняючы ад захопнікаў, за што атрымлівалі высокія пасады, тытулы і радавыя гербы.

▼ Сядзіба Ордаў каля Варацэвічаў. Малюнак Н. Орды. 1860 год



Нараджэнню хлопчыка Міхал Орда быў надзвычай рады. Якраз у той час, у 1807 годзе, ён, як чалавек ваенны, захапляўся еўрапейскімі вайсковымі паходамі Напалеона Банапарта. З марай пра бліскучую вайсковую кар'еру сына ён і назваў яго ў гонар французскага імператара. Аднак парадавацца жыццёвым поспехам свайго нашчадка Міхал Орда не паспеў: ён заўчасна памёр, калі хлопчыку ледзьве споўнілася паўтара года.

Гадаваць сына маці давялося адной. Але, нягледзячы на гэта, яна здолела выхаваць хлопчыка сапраўдным мужчынам, прывіла яму пачуццё шляхецкай годнасці і абавязку перад Бацькаўшчынай. Атрымаў Напалеон і добрую хатнюю адукацыю, у тым ліку і музычную. Урокі ігры на фартэпіяна яму давала якраз маці – таленавітая піяністка. Калі ёй было дзевяць гадоў, у доме бацькоў у Пінску ў 1784 годзе гасцяваў апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Паводле сведчання сучаснікаў, манарх быў зачараваны віртуознай ігрой таленавітай дзяўчынкі. Сваю любоў да музыкі Юзафіна Орда-Бутрымовіч перадала і сыну.

## Свіслач

У 12-гадовым узросце Напалеон Орда быў залічаны ў Гродзенскую губернскую акадэмічную гімназію, што дзейнічала на грошы графа Вінцэнта Тышкевіча ў мястэчку Свіслач. Гэта даволі буйная навучальная ўстанова з'яўлялася базавай школай Віленскага ўніверсітэта. Яна мела моцны прафесарска-настаўніцкі склад і славілася высокім узроўнем выкладання прадметаў. Разам з тым у сценах гімназіі лунаў дух вальнадумства.

У Свіслачы юнак уліўся ў асяроддзе аднадумцаў, выхадцаў з беларускай шляхты, якія марылі пра незалежнасць зямель былой Рэчы Паспалітай. Аб'яднаўшыся ў сваіх поглядах, яны стварылі тайнае таварыства «Заране», актыўным членам якога стаў і Напалеон Орда. Назва арганізацыі паходзіла ад часу правядзення патаемных сходак: на іх гімназісты збіраліся надвячоркам, калі ў небе з'яўляліся зоркі. Аднак намеры ў гэтых высакародных летуценнікаў былі зусім не рамантычныя – «заранаўцы» выказвалі свой пратэст супраць палітыкі царскіх улад, запальвалі рэвалюцыйнымі настроямі іншых гімназістаў, ім нават удалося схіліць на свой бок некалькіх выкладчыкаў. Зразумела, што такія паводзіны малалетніх патрыётаў не маглі не трапіць пад увагу паліцыі. Найбольш актыўных з іх, у тым ліку і Напалеона Орду, затрымалі. Але арышт быў нядоўгім – пасля правядзення адпаведнай растлумачальнай работы ўсіх «бунтароў» адпусцілі. Праўда, заведзеныя на юнакоў справы ўсё ж трапілі ў сейфы царскай ахранкі, а саміх іх узялі пад паліцэйскі нагляд. Тым не менш палітычна ненадзейны Н. Орда ў 1823 годзе паспяхова скончыў навучанне ў гімназіі і адразу ж паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Віленскага ўніверсітэта.




▲ Аўтапартрэт Напалеона Орды

## Вільня

Вільня і яе бурлівае жыццё першай чвэрці XIX стагоддзя наклала свой адбітак на далейшае жыццёвае сталенне юнака. Акурат у год яго паступлення ў Віленскі ўніверсітэт царская ахранка разграміла нелегальныя студэнцкія таварыствы філаматаў і філарэтаў. Але цалкам вынішчыць свабодалюбівыя настроі паліцыі не ўдалося. У асяроддзі віленскага студэнцтва па-ранейшаму дзейнічалі тайныя таварыствы і гурткі. Праўда, іх дзейнасць мела значна меншы, чым у арыштаваных папярэднікаў, грамадскі рэзананс. Першакурснік Н. Орда, які атрымаў пачатковае «палітычнае выхаванне» яшчэ ў час свайго навучання ў гімназіі, не мог заставацца ўбаку ад студэнцкага патрыятычнага руху. Практычна адразу ж ён апынуўся ў гушчы падзей.

Тры гады Н. Орду і яго паплечнікам удавалася ўтойваць свае крамольныя погляды. Але ў ліпені 1826 года жандары






▲ Музей Напалеона Орды ў вёсцы Варацэвічы

змаглі высачыць студэнтаў-патрыётаў. Іх арыштавалі, яны адразу ж былі выключаны з універсітэта. На гэты раз зняволенне для Напалеона і дзесяці яго сяброў па вучобе і палітычнай барацьбе аказалася значна больш працяглым – цэлых 15 месяцаў, пакуль ішло следства, правялі яны ў турме.

Увесь гэты час Юзафіна Орда-Бутрымовіч дабівалася вызвалення сына, звярталася да высокіх чыноўнікаў і ўсялякіх вяльможаў з просьбай узяць яго на парукі. Але адусюль атрымлівала толькі кпіны і адмовы. Вядома, што цэсарэвіч Канстанцін Паўлавіч, на той час намеснік расійскага імператара ў Царстве Польскім, якому яна таксама адаслала сваё прашэнне, вырашыў яшчэ і паздзекавацца з прыгнечанай горам жанчыны – ён распарадзіўся спагнаць з яе грошы за выкарыстаную для напісання адказу, зразумела ж, адмоўнага, паперу.

Не знайшоўшы важкіх доказаў нелегальнай палітычнай дзейнасці Напалеона Орды, улады ўсё ж вымушаны былі вызваліць яго з-за кратаў. А паколькі на прадаўжэнне вучобы ва ўніверсітэце юнак не меў ужо права, яму давялося пакінуць Вільню і ехаць да маці ў Варацэвічы.

## Варшава

Залічаны ў кагорту палітычна нядобранадзейных, Н. Орда, па сутнасці, аказаўся выкінутым з жыцця. Магчыма, можна было змірыцца з лёсам, адмовіцца ад сваіх патрыятычных поглядаў і скіраваць намаганні на больш надзённыя справы. Але ўсё гэта было не для свабодалюбівага Напалеона. Застаўшыся верным сваім жыццёвым прынцыпам, ён вырашыў стаць прадаўжальнікам вайсковых традыцый сваіх прашчураў і паступіў на службу жаўнерам у конную гвардыю раскватараванага ў Варшаве Літоўскага корпуса расійскай арміі. Праўда, праслужыў там нядоўга: у 1830 годзе ўспыхнула паўстанне за аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года, якое Н. Орда не мог не падтрымаць. Гэтай падзеі ён прысвяціў нават палымяны верш «Літвін да палякаў», які, магчыма, прылюдна прачытаў сваім саслужыўцам перад сыходам у стан інсургентаў. Дарэчы, Напалеон Орда, як і большасць беларускай шляхты, лічыў сябе літвінам – так у яго бытнасць і пазней называлі беларусаў, жыхароў Гродзенскай, Віленскай і Мінскай губерняў.

Гістарычныя дакументы падаюць вельмі мала звестак пра вайсковы побыт Н. Орды ў час паўстання 1830–1831 гадоў. Вядома, што ён быў залічаны падпаручнікам у Галоўны штаб паўстанцкіх войскаў у Варшаве, ваяваў на тэрыторыі сучаснага Люблінскага ваяводства Польшчы. За мужнасць, праяўленую ў баях з расійскімі войскамі каля мястэчка Коцк, яго ўзнагародзілі польскім ордэнам Virtuti

▼ Адна з экспазіцыйных залаў музея



Militari («Ваенная доблесць») і надалі чын капітана. У пачатку верасня 1831 года ўрадавыя войскі на чале з генерал-фельдмаршалам Іванам Паскевічам разбілі наладжаную інсургентамі абарону Варшавы і захапілі горад. Пасля чаго паўстанне пачало згасаць, а ацалелыя атрады вымушаны былі ратавацца за межамі Расійскай імперыі. У адным з іх адступіў на тэрыторыю Галіцыі, якая тады ўваходзіла ў склад Аўстрыйскай імперыі, і капітан Орда.

## Эміграцыя

Аднак чужая зямля Напалеона не вабіла, і ён таемнымі дарогамі вяртаецца ў Варацэвічы. Але заставацца дома было небяспечна, бо пачаліся ганенні на ўдзельнікаў паўстання. 21 кастрычніка 1831 года следчая камісія аднесла яго да «злачынцаў 2-га разраду», – такіх чакала сібірская катарга. Акрамя гэтага, Н. Орду пазбавілі правоў на радавы маёнтак, праўда, пры гэтым пакінулі яго ў пажыццёвае валоданне маці. Каб не трапіць у ссылку, Напалеон вырашыў шукаць паратунку за мяжой. З расійскім пашпартам на імя Завадскага – слугі аднаго са сваіх сяброў, ён з болем у душы пакідае родныя мясціны.

Эмігранцкі шлях Н. Орды пралягаў праз Аўстрыю, Швейцарыю, Італію, але яго мэтай было дасягнуць Парыжа і знайсці там прытулак. Улады тагачаснай Францыі з разуменнем ставіліся да выгнаннікаў з былой Рэчы Паспалітай, тым не менш паліцыя падазрона аднеслася да грамадзяніна Расіі Завадскага і пачала сачыць за ім. «Таму я, каб пазбегнуць непрыемнасцей, – адзначаў пазней Н. Орда ў сваіх успамінах, якія пісаў для сына Вітольда, – і маючы знаёмых сярод ваенных, якія маглі б засведчыць сапраўднае маё імя, сам пайшоў у паліцыю і пакаяўся, што я эмігрант…». Дзякуючы гэтаму прызнанню і ўплывовым сувязям землякоў, праблему ўдалося ўладзіць: Напалеону выдалі «ліст адкрытага знаходжання» – своеасаблівы від на жыхарства, як эмігранту прызначылі штомесячную дапамогу і дазволілі жыць у Парыжы.



▲ Сядзіба Касцюшкаў у фальварку Мерачоўшчына каля Косава. Малюнак Н. Орды

У французскай сталіцы Н. Орда знайшоў многіх сваіх знаёмых, былых студэнтаў Віленскага ўніверсітэта і жаўнераў з паўстанцкіх атрадаў. Але гэта не ратавала яго ад неўладкаванасці побыту і матэрыяльнай нястачы. Пэўную жыццёвую спатолю знаходзіць Напалеон толькі ў творчасці. Нашмат пазней, ужо будучы славутым мастаком і кампазітарам, ён скажа, што на чужыне, калі знаходзіўся ў складаных жыццёвых абставінах, найлепшым чынам праявіліся перададзеныя яму ад бацькоў таленты: яго захапляе музыка і вабіць жывапіс.

## Сябры

А пакуль жа ён бярэ ўрокі малявання ў вядомага французскага мастака, майстра архітэктурнага пейзажа П’ера Жэрара і адначасова ўдасканальвае сваю ігру на фартэпіяна. Прычым музыку яму выкладаў вялікі Фрэдэрык Шапэн. Даволі хутка яны сталі шчырымі сябрамі. Славуты музыкант любіў іграць з Напалеонам на фартэпіяна ў чатыры рукі. А ўдзячны вучань пераймаў у свайго настаўніка ўсё лепшае ў музычным майстэрстве. Ф. Шапэн высока ацэньваў здольнасці Н. Орды, натхняў яго на напісанне ўласных кампазіцый. У знак сваёй вялікай удзячнасці Напалеон ужо пасля смерці кампазітара прысвяціў яму адзін з лепшых сваіх твораў – паланэз № 12.

У доме Ф. Шапэна Напалеон Орда адпачываў душой. Там ён сустрэўся з многімі цікавымі людзьмі. Сярод іх былі і вядомыя ў той час кампазітары Ферланц Ліст, Джаакіна Расіні і Гаэтана Даніцэці, якія таксама ўсяляк падтрымлівалі музычнага творцу-пачаткоўца. І пад іх уплывам ён пачаў пісаць паланэзы, вальсы, серэнады, калыханкі, песні на словы паэтаў Стафана Вітвіцкага і Адама Плуга, таму паступова стаў прыкметнай асобай у эміграцкім асяроддзі выхадцаў з былой Рэчы Паспалітай.

З часам ён уступіў у шэрагі гісторыка-літаратурнага таварыства. Гэта дало магчымасць яму бліжэй пазнаёміцца з Адамам Міцкевічам і таксама стаць сябрам яго сям'і. Разам з жонкай паэта Цэлінай Шыманоўскай Н. Орда наладжваў у доме Міцкевічаў цудоўныя музычныя вечары. Паводле некаторых звестак, ён выдаткаваў сродкі на выданне зборнікаў лекцый А. Міцкевіча для французскамоўных чытачоў.

## Парыж

У 1847 годзе Напалеону Орду прапанавалі стаць дырэктарам Італьянскай оперы ў Парыжы, і ён з радасцю прымае прапанову. Нарэшце ў яго з'явілася пастаянная работа, і адбылося гэта ў самы патрэбны момант: пару гадоў таму ён ажаніўся з француженкай Ірэн Багле, якая нарадзіла яму сына Вітольда. Цяпер Напалеон быў не адзін, на ім ляжаў клопат пра сям'ю. Але, на жаль, праз некаторы час тэатр быў закрыты. Які-ніякі прыбытак давала толькі педагагічная дзейнасць, і Н. Орда стаў займацца справай, якая гарантавала пэўны дабрабыт. Сучаснікі адзначалі: пад кіраўніцтвам Ф. Шапэна Напалеон дасягнуў такой высокай ступені фартэпіяннага майстэрства, што карыстаўся ў Парыжы папулярнасцю як выдатны педагог. Яго сталі актыўна запрашаць у якасці настаўніка музыкі для сваіх дзяцей заможныя парыжане, і на першым часе гэта не магло не радаваць.


Помнік Напалеону Орду ў горадзе Іванава

Адначасова Напалеон Орда захапляецца мастацтвам. У майстэрні ўжо згаданага П. Жэрара ён хутка засвойвае законы жывапісу, графікі і нават скульптуры. Яго тонкая назіральнасць і высокі мастацкі густ дазвалялі з натуры перадаваць у акварэльнай тэхніцы, малюнку алоўкам ці пастэлі самае прыгожае, прыкметнае і запамінальнае.

## Па Еўропе

Не толькі Парыж з яго вялікай гістарычнай спадчынай і непаўторным маляўнічым каларытам натхняў мастака. Напалеон адчуў у сабе вялікую прагу да творчых падарожжаў. Штогод у летнія месяцы ён вандраваў па Францыі, наведваў Партугалію, Іспанію і асобныя рэгіёны Прусіі. З вялікім імпэтам і захапленнем мастак працаваў з натуры, выбіраючы для адлюстравання мясціны, напоўненыя рамантычнымі чарамі, – напаўразбураныя замкі, утульныя вясковыя сядзібы, мястэчкі. Пазней Н. Орда прызнаваўся: калі адлюстроўваў тое, што да яго не прыкмячаў ніводны іншы пейзажыст, то ён адчуваў сябе першаадкрывальнікам. Па сутнасці гэта так і было. Менавіта Н. Орда ў сваіх малюнках змог аб'яднаць звычайнае і рамантычнае, падаць сюжэт цікава і захапляльна.

Прыгажосць чужых краёў імпанавала Напалеону Орду, маляванне давала пэўны даход, але і настальгія па радзіме з кожным годам расла. Яму пастаянна сніліся родныя мясціны. І творца не вытрымаў – як толькі ў 1856 годзе царскім указам была абвешчана амністыя палітычным эмігрантам, уцекачам з Расійскай імперыі, Н. Орда вырашае вярнуцца на сваю радзіму.

## Назад у Варацэвічы

Сустрэча з бацькоўскімі Варацэвічамі радавала і адначасова засмучала Н. Орду. Знаёмыя краявіды абуджалі радасныя ўспаміны, а жыццёвыя рэаліі параджалі няпростыя праблемы. Як памятаем, помсцячы за ўдзел Напалеона ў паўстанні, улады наклалі на маёнтак Ордаў арышт. Маці як магла абараняла жытло, і пакуль сын быў за мяжой, яе не чапалі. А калі Напалеон вярнуўся, сітуацыя змянілася. Не дапамаглі ні амністыя, ні заступніцтва павятовага прадвадзіцеля дваранства. Пасля смерці ў 1859 годзе маці варацэвіцкі маёнтак перайшоў у дзяржаўны скарб, а Напалеон Орда быў пазбаўлены спадчыны і, натуральна, уласнага дома. У якасці кампенсацыі атрымаў толькі 5790 рублёў 50 капеек, хоць уся маёмасць была ацэнена на большую ў 25 разоў суму.

Каб мець сродкі для існавання, Напалеону Орду давялося адкрыць у сабе яшчэ і прадпрымальніцкую жылку. Ён узяў у арэнду фермы, што існавалі пры ўжо былым яго маёнтку, і заняўся гадоўляй жывёлы, у тым ліку і авечак рэдкай для палескіх абшараў іспанскай пароды. Набыўшы сучасныя сельгасмашыны, стаў займацца асушэннем навакольных балот. Чахарда гаспадарчых клопатаў не зацьміла ў ім прагу да мастацтва, ён па-ранейшаму музіцыраваў, для свайго задавальнення наладжаваў канцэрты і маляваў для душы беларускія краявіды. Магчыма, так бы і працякала яго жыццё на радзіме, але ў 1863 годзе ўспыхнула яшчэ адно паўстанне супраць царскіх улад.

Прамых сведчанняў пра ўдзел Напалеона Орды ў паўстанні 1863–1864 гадоў даследчыкам яго жыццяпісу адшукаць не ўдалося. Але бяспрэчна, што ён не мог застацца ўбаку ад барацьбы за свабоду роднага краю. Падазравалі гэта і ўлады, якія пасля задушэння паўстання распачалі над ім следства. Тады і выявілася, што некалькі людзей з двара Н. Орды пайшлі ў паўстанцкі атрад Рамуальда Траўгута, які дзейнічаў на Палессі. У самога Напалеона знайшлі некалькі патрыятычных вершаў. Гэтага хапіла для арышту.



▲ Палац Скірмунтаў у вёсцы Моладава. Малюнак Н. Орды. 1864 год

Следства цягнулася цэлы год. Да абвінавачанняў дадалі і тое, што яго сын Вітольд служыць у французскай арміі. Тады з падачы жонкі ў справу ўмяшаўся пасол Францыі ў Расіі. І гэта дапамагло: у 1867 годзе Н. Орду выпусцілі з турмы пад падпіску, што да заканчэння следства ён будзе жыць у маёнтку Моладава (сёння – вёска ў Іванаўскім раёне) ў сям'і сястры Гартэнзіі Скірмунт. Там Напалеон і знайшоў спатолю сваёй змучанай душы. А пасля таго, як яшчэ праз год з яго былі зняты ўсе абвінавачанні, лёс, нарэшце, над ім злітаваўся. І ў родных мясцінах ён зноў стаў займацца сваім любімым жывапісам.

## Свет яго захапленняў

Напалеон Орда шмат падарожнічаў, наведваў Гродна, Варшаву, Вільню, Кіеў, Люблін, Познань… Працуючы хатнім

настаўнікам сына генерала Ржавускага, ён з алоўкам і мальбертам абышоў практычна ўсю Валынь. Пра сваё творчае захапленне Напалеон у 1876 годзе пісаў свайму сябру Ігнату Дамейку ў Чылі: «З 1856 года знаходжуся ў краі, і, як ведаеш, быў мастаком-аматарам. Пасля вяртання мне ў галаву прыйшла шчаслівая думка наведаць нашу правінцыю, так дарагую нашаму сэрцу, аднак так мала знаёмую суайчыннікам. Падарожнічаючы з алоўкам у руцэ, маляваў рэшткі нашага мінулага і цывілізацыі. Зрабіў каля 1000 малюнкаў і пачаў выдаваць альбом, які, дзякуй богу, у мяне добра ідзе. Працу сваю не закончыў і, нягледзячы на свае 70 гадоў, яшчэ хачу наведаць Віленскую, Гродзенскую, Мінскую і Магілёўскую губерні».

І задуманае яму ўдалося здзейсніць. Напалеон Орда пабываў у большасці гарадоў і вёсак сучаснай Беларусі. У час сваіх творчых вандровак ён рабіў замалёўкі архітэктурных і гістарычных помнікаў, а таксама мясцін, звязаных з жыццём і дзейнасцю знакамітых людзей. Вынікам гэтага стаў збор з больш як 200 прысвечаных менавіта беларускім краявідам мастацкіх твораў, выкананых алоўкам на аркушы паперы невялікага фармату (даўжынёй каля 30 см), а пасля расфарбаваных акварэллю, гуашшу ці сепіяй. Гэтая тэхніка малявання дазваляла найбольш дакладна адлюстраваць натурны краявід ва ўмовах падарожжа.

Як адзначаюць мастацтвазнаўцы, такі пратакольна сухі жанр, як архітэктурна-ландшафтны пейзаж, Н. Орда зрабіў сапраўдным мастацтвам. Многія яго творы «маюць філасофскі характар, дзе руіны замкаў – гэта сімвалы часу, а самі замкі – сімвалы слаўнага мінулага роднага краю». Мастак «дэталёва і скрупулёзна перадаў выявы помнікаў дойлідства, палацаў, замкаў, храмаў, тым самым не проста засведчыў любоў да роднага краю, ён ганарыўся яго багатай культурай і гісторыяй… Вялікая каштоўнасць малюнкаў Орды і ў тым, што на іх захаваліся відарысы тых архітэктурных помнікаў, якія не ацалелі да нашага часу або былі перабудаваны. Дзякуючы малюнкам Орды, мы маем магчымасць убачыць страчаную архітэктурную спадчыну Беларусі».

Толькі па малюнках Напалеона Орды мы сёння можам меркаваць, як выглядалі «радзінныя гнёзды» многіх славутых дзеячаў еўрапейскай культуры, ураджэнцаў Беларусі: прынамсі, у вёсцы Убель на Чэрвеньшчыне, дзе нарадзіўся кампазітар Станіслаў Манюшка, у Смольгаве на Любаншчыне, радзіме паэта Уладзіслава Сыракомлі, у Жукавым Барку, дзе пэўны час жыў і працаваў пісьменнік Адам Плуг… Двойчы маляваў Орда і сваю родную сядзібу каля Варацэвічаў – яна была цалкам знішчана ў гады Першай сусветнай вайны. Дарэчы, некаторыя малюнкі Н. Орды саслужылі добрую справу падчас аднаўлення і рэстаўрацыі гістарычных архітэктурных помнікаў: Уваскрасенскай царквы ў Віцебску, касцёла Святой Дзевы Марыі ў Мінску, сядзіб у Завоссі, дзе з’явіўся на свет знакаміты Адам Міцкевіч, і ў Мерачоўшчыне – на радзіме Тадэвуша Касцюшкі.

Як ні дзіўна, але свае работы Напалеон Орда ніколі не прадаваў і нават не дарыў сябрам і знаёмым. Ён іх выдаваў у грунтоўных мастацкіх альбомах. Першы з іх Album widoków historycznych

▼ **Album widoków historycznych Polski («Альбом гістарычных выяў Польшчы») – першае мастацкае выданне малюнкаў Н. Орды. Вокладка**



Polski («Альбом гістарычных выяў Польшчы») выйшаў у 1873 годзе ў Варшаве. На вокладку мастак змясціў літаграфію з відарысам родных Варацэвічаў і сентыментальны надпіс: «Уласнасць роду Ордаў на працягу 300 гадоў да 1831 года – незабыўная і дарагая для аўтара Радзіма». А ўсяго ён выдаў восем выпускаў сваіх мастацкіх работ, у якіх было змешчана 260 літаграфій паводле ягоных малюнкаў.

Жывучы на радзіме, не забываўся Напалеон Орда і пра музыку. Свой багаты вопыт педагога ён выкарыстаў у падручніку Gramatyka muzyki («Граматыка музыкі»). Вялікі маэстра Станіслаў Манюшка, прызнаўшы яе надзвычай карыснай для навучэнцаў, зазначыў: «З яе дапамогай, напэўна, не адзін з іх у музыцы выйдзе ў людзі». Ды і кампазітарская вядомасць Н. Орды сягала далёка за межы Палесся: яго музычныя творы – паланэзы, вальсы, мазуркі, накцюрны, серэнады выконваліся лепшымі аркестрамі Польшчы. У 1880 годзе кампазітар стаў членам Варшаўскага таварыства заахвочвання прыгожага мастацтва. Ён таксама быў адным з заснавальнікаў Мінскага музычнага таварыства, стваральнікам фонду для падтрымкі здольных вучняў рэальнай школы ў Пінску.

Дарэчы, з поспехам музычныя творы Н. Орды выконваюць і сучасныя мастацкія калектывы. Але найбольш актыўным іх папулярызатарам з'яўляецца Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі Міхаіла Фінберга. Увогуле ж, як зазначае адзін з даследчыкаў музычнай спадчыны кампазітара доктар мастацтвазнаўства Вольга Дадзіёмава, у творах Н. Орды «ўвасобіліся карэнныя, тыпалагічна адметныя ўласцівасці айчыннай культуры – культуры славянскага, еўрапейскага сумежжа, чые сыны арганічна ўваходзілі ў еўрапейскі мастацкі, у тым ліку музычны, свет».

Напалеон Орда быў вялікім патрыётам беларускай зямлі. Ён рабіў усё магчымае, каб уславіць родныя мясціны і не толькі іх. А колькі б ён змог зрабіць яшчэ, калі б жыццёвыя нягоды не адбіралі сілы?..

## Варшава – Янава

Памёр вядомы мастак і кампазітар 26 красавіка 1883 года ў Варшаве, куды прыехаў на лячэнне. Яго сябра пісьменнік Адам Плуг напісаў у некралогу: Напалеон Орда – «высакародная асоба, чалавек, жыццё якога было чыстым, як сляза, як шабля воіна, а найперш – ён горача любячы Айчыну сын». І гэта сапраўды так.

Згодна з завяшчаннем Напалеона Орду пахавалі на могілках у Янаве (цяпер – горад Іванава Брэсцкай вобласці) побач з маці. Час і бурлівыя падзеі XX стагоддзя зруйнавалі яго магілу, але нядаўна, дзякуючы таму, што ўдалося адшукаць парэшткі, яе аднавілі як мемарыяльнае пахаванне. У 1997 годзе ў Іванаве быў устаноўлены помнік, а ў 2015-м у вёсцы Варацэвічы адкрыты музей Н. Орды. Яго навуковы супрацоўнік Ларыса Дрычыц вельмі падрабязна расказвала нам пра жыццёвы шлях і творчую спадчыну земляка, знакамітага мастака і кампазітара. А яшчэ непадалёк ад вёскі, ва ўрочышчы Чырвоны бор, плануецца на ранейшым месцы аднавіць радавую сядзібу Ордаў, каб у перспектыве яна магла стаць унікальным музейным аб'ектам. Ужо зроблена многае, але з-за цяжкасцей з фінансаваннем работы прыпынены...

***

На жаль, у варацэвіцкім музеі сярод многіх цікавых экспанатаў, якія расказваюць пра жыццёвы і творчы шлях Н. Орды, пакуль няма ніводнага арыгінала яго малюнкаў. Ды што ў Варацэвічах? Арыгінальных твораў мастака ў Беларусі няма ўвогуле. Яго мастацкая спадчына – каля тысячы малюнкаў і акварэляў – захоўваецца ў Нацыянальным музеі Польшчы ў Кракаве. Але ад гэтага асоба Напалеона Орды, чалавека, які прысвяціў сябе служэнню беларускай, роднай для яго зямлі, для нас сённяшніх ніколькі не становіцца менш значнай.

**Сяргей ГАЛОЎКА**

**Мінск – Варацэвічы – Іванава – Мінск**

▼ **Мемарыяльная магіла Напалеона Орды ў горадзе Іванава**

